324 (47:47.60)
П 16

П. К. ПАНАМАРЭНКА

# ПРАМОВА

## НА ПЕРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ МІНСКАЙ СЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзяржаўнае выдавецтва БССР
Мінск 1946

324(47:47.60)
П16

П. К. ПАНАМАРЭНКА

38657/6 др

# ПРАМОВА

## НА ПЕРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ МІНСКАЙ СЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

*(Скарочаная стэнаграма)*

Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800000 927855

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1946

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Янв. 1954 г.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Таварышы!

Дазвольце ў вашай асобе прынесці падзяку ўсім выбаршчыкам Мінскай сельскай выбарчай акругі за аказанае мне высокае давер'е — вылучэнне мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Дазвольце запэўніць вас і ўсіх выбаршчыкаў Мінскай сельскай выбарчай акругі, што я пастараюся апраўдаць гэтае давер'е. Гэтую найвялікшую чэсць і давер'е я адношу да партыі Леніна — Сталіна, членам якой я з'яўляюся. Я расцэньваю гэтае давер'е адносна маёй кандыдатуры, як давер'е выбаршчыкаў ураду і бальшэвіцкай партыі Беларусі. *(Бурныя апладысменты.)*

Таварышы!

Наша дзяржава, наша вялікая соцыялістычная Радзіма знаходзіцца зараз напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР, напярэдадні падзеі, маючай велізарнейшае гістарычнае і палітычнае значэнне ў жыцці нашай краіны.

Выбары ў вярхоўны орган нашай дзяржавы праходзяць ва ўмовах мірнага развіцця нашай краіны, у абстаноўцы высокага палітычнага ўздыму, выкліканага найвялікшымі перамогамі, атрыманымі

совецкім народам у жорсткай барацьбе з гітлераўскай Германіяй і імперыялістычнай Японіяй. Выбары праходзяць у абстаноўцы вялікага творчага ўздыму нашага народа, які пасля разгрому ворагаў з велізарным энтузіязмам узяўся за рашэнне задач адраджэння народнай гаспадаркі, разбуранай вайной.

У Вялікай Айчыннай вайне народы Совецкага Саюза атрымалі сусветна-гістарычную перамогу над ворагам, адстаялі свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.

Большэвіцкая партыя падняла, натхніла і арганізавала мільённыя масы нашага народа на гераічную справядлівую барацьбу з нападаўшым ворагам, мабілізавала ўсе матэрыяльныя і духоўныя сілы народа і накіравала іх да агульнай мэты — на ваенны і маральна-палітычны разгром фашызма, на заваяванне перамогі над самымі чорнымі сіламі рэакцыі і злейшымі ворагамі нашай соцыялістычнай айчыны і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — нямецкімі і японскімі захопнікамі.

Совецкі народ і яго ўзброеныя сілы не толькі адстаялі сваю Радзіму ад пасяганняў імперыялістычных захопнікаў, але і выканалі вялікую вызваленчую місію — выратавалі еўрапейскую цывілізацыю ад нямецкіх пагромшчыкаў, дапамаглі другім народам заваяваць свабоду і нацыянальную незалежнасць. *(Апладысменты.)*



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Наша Совецкая дзяржава, аснаваная Леніным і кіруемая таварышом Сталіным, паказала сябе ў гады Вялікай Айчыннай вайны самай моцнай і непахіснай з усіх дзяржаў свету, вышла пераможцай з самых цяжкіх выпрабаванняў, таму што:

палітычны лад Совецкага Саюза аказаўся больш устойлівым і моцным, чым палітычны лад якой-небудзь другой дзяржавы;

эканамічная аснова Совецкай дзяржавы аказалася непараўнальна больш жыццездольнай, чым эканоміка варожых дзяржаў;

узброеныя сілы СССР і іх арганізацыя аказаліся больш перадавымі і дасканалымі, чым узброеныя сілы нашых ворагаў;

знешняя палітыка Совецкай дзяржавы аказалася больш гібкай, дальнавіднай і дзейснай, чым знешняя палітыка варожых дзяржаў.

Урокі вайны сведчаць аб перавазе совецкай ідэалогіі над ідэалогіяй нашых праціўнікаў, сведчаць аб невычарпальных маральных сілах Совецкай дзяржавы.

Соцыялістычны лад, які ўвасобіў у жыццё неўміручыя ідэі ленінска-сталінскага вучэння, даў нашаму народу вялікую і непераадольную сілу. На аснове совецкага ладу ў нашай краіне вырашаны найвялікшыя гістарычныя і соцыяльна-палітычныя задачы. Вырашаны задачы ліквідацыі антаганізма класаў і знішчэння эксплаатацыі чалавека чалаве-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

кам, задачы стварэння і ўмацавання саюза працоўных класаў і маральна-палітычнага адзінства грамадства. Вырашаны задачы ліквідацыі міжнацыянальнай варожасці і нацыянальнага гнёту, задачы аб'еднання ўсіх народаў на базе брацкага супрацоўніцтва і ўзаемнай дапамогі. Вырашаны задачы гарманічнага спалучэння асабістых і грамадскіх інтарэсаў і ліквідацыі супярэчнасці паміж інтарэсамі большасці народа і дзяржавай. Вырашаны задачы стварэння сапраўды народнай дзяржавы.

Гісторыя чалавецтва ведае многа розных форм грамадскага ладу. Але толькі наш, савецкі лад аказаўся такой формай грамадскага ладу, якая дае магчымасць самому народу кіраваць дзяржавай.

Усе гэтыя сусветна-гістарычныя дасягненні Савецкай дзяржавы ў нашай краіне і з'яўляюцца галоўнай асновай Сталінскай Канстытуцыі.

Геніяльнае прадбачанне таварыша Сталіна, указаўшага дзесяць год таму назад, што «Новая Канстытуцыя СССР будзе абвінаваўчым актам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што соцыялізм і дэмакратыя непераможны», — апраўдалася поўнасцю.

Вярхоўны Совет СССР першага склікання, выбраны на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні, выканаў сваю гістарычную ролю. Ён з чэсцю правёў Савецкую дзяржаву праз годы грандыёзнага мірнага



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

будаўніцтва, праз найцяжэйшыя выпрабаванні вайны да поўнай перамогі над ворагамі нашай Радзімы.

10 лютага 1946 года народы нашай краіны ўручаць дэпутацкія паўнамоцтвы лепшым сваім сынам і дочкам. Гэтыя выбары будуць новым найярчэйшым трыумфам совецкай дэмакратыі і нябачанай па сваёй сіле і выразнасці дэманстрацыяй совецкага патрыятызма, найвялікшага адзінства і маналітнасці нашага соцыялістычнага грамадства.

Партыя большэвікоў выступае ў гэтых выбарах, як і ў папярэднюю выбарную кампанію, у блоку з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, служачымі і інтэлігенцыяй. Гэты блок сведчыць аб той блізасці, якая існуе ў нашай краіне паміж партыйнымі і беспартыйнымі, сведчыць аб згуртаванні совецкіх людзей вакол комуністычнай партыі і яе палітыкі, сведчыць аб найвялікшым маральна-палітычным адзінстве совецкага народа.

Цесны саюз комуністаў і беспартыйных высунут самім жыццём. Народ ведае, што партыя большэвікоў — яго родная партыя, якая прышла да яго не з боку, а з нетраў самога народа, ведае, што ў партыі большэвікоў няма іншых мэт, апрача абароны інтарэсаў народа. Вось чаму беспартыйныя адзінадушна падтрымліваюць кандыдатаў комуністаў таксама, як комуністы адзінадушна падтрымліваюць кандыдатаў беспартыйных. Адзінадушнае

галасаванне за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных—ёсць адзінадушнае галасаванне за палітыку партыі і няўхільнае правядзенне яе ў жыццё.

Таварышы!

У тытанічнай пабеданоснай барацьбе народаў Совецкага Саюза супроць нямецка-фашысцкай Германіі і яе васалаў беларускі народ заняў дастойнае месца. У гэтай барацьбе народ Беларусі вырас, узмацнеў і загартаваўся. І ніколі яшчэ адзінства і згуртаванасць беларускага народа вакол большэвіцкай партыі, вакол вялікага правадыра і палкаводца таварыша Сталіна не былі такімі моцнымі, як цяпер.

У справу разгрому гітлераўскай Германіі беларускі народ унёс свой велізарны ўклад. Больш аднаго мільёна беларусаў змагалася ў радах Чырвонай Арміі на ўсіх франтах Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з першых герояў Айчыннай вайны, бясстрашны сын нашага народа, капітан Гастэла ў вяках праславіў сябе сваім подвігам, накіраваўшы свой палаючы самалёт у скапленне варожых войск. У цяжкія дні, калі вораг падступаў да сэрца нашай Радзімы — Масквы, яе доблесна абаранялі часці генерал-маёра Льва Даватара — сына калгасніка вёскі Хоціна, Віцебскай вобласці. У небе Масквы, абараняючы яе ад паветраных бандытаў, змагаўся храбры лётчык Герой Совецкага Саюза беларус Віктар Талаліхін. За горад Леніна да апошняй

кроплі крыві змагаліся беларусы: выдатны снайпер Феадосій Смалячкоў, контр-адмірал Дрозд, іменем якога назван адзін з баявых караблёў Балтыйскага флота, марскі лётчык Герой Совецкага Саюза Антоненка. Тысячы воінаў-беларусоў узнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза за праяўлены гераізм, мужнасць і доблесць у Вялікай Айчыннай вайне. Больш чым 200 воінам-беларусам прысвоена высокае званне Героя Совецкага Саюза. З асяроддзя беларускага народа вышлі 217 генералаў, якія ў Вялікую Айчынную вайну вадзілі ў бой свае бясстрашныя палкі, дывізіі і арміі супроць гітлераўскіх захопнікаў.

На часова акупіраванай тэрыторыі нашай рэспублікі па закліку вялікага Сталіна ўвесь народ падняўся на бяспрыкладную ў гісторыі партызанскую вайну. Беларускі народ бачыў, што прабыванне пад нямецка-фашысцкім ярмом азначала для яго не толькі страту ўсякай свабоды і нацыянальнай самастойнасці, не толькі жабрацкае, поўгалоднае рабскае існаванне, але і проста фізічнае знішчэнне. Ён ведаў, што гутарка ідзе аб жыцці або смерці нацыі.

Уварваўшыся ў Беларусь, немцы адабралі ў беларускага народа зямлю, заваяваную Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыяй і навечна замацаваную за калгасамі совецкай уладай, фабрыкі і заводы, школы, тэатры, навучальныя

ўстановы. Яны разграбілі больш палавіны нацыянальнага багацця нашага народа, пазбавілі яго ўсіх правоў, якімі свабодна карыстаўся ён пры савецкай уладзе.

Нямецка-фашысцкія захопнікі з асаблівым азвярэннем і злосцю абрушыліся на калгасны лад. Яны не толькі грабілі сялянскае дабро і разаралі калгасную гаспадарку, а як носьбіты самага разбойніцкага імперыялізма і рэакцыі яны па-зверску распраўляліся з калгасным сялянствам, прабуючы зламаць яго свабодалюбівы, рэвалюцыйны дух, падарваць яго адданасць совецкай уладзе. Нямецкія захопнікі не маглі дараваць нашаму сялянству той факт, што яно, далучыўшыся да справы будаўніцтва социялізма па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам совецкай улады, прарабіла найглыбейшы рэвалюцыйны пераварот, у выніку якога ў нашай краіне адным ударам быў ліквідаван самы шматлікі эксплаататарскі клас, клас кулакоў, і была створана соцыялістычная база совецкай улады ў самай вялікай і жыццёва неабходнай галіне народнай гаспадаркі — у сельскай гаспадарцы.

Шляхам жорсткага тэрора, страшэннага разбою і грабяжу нямецкія захопнікі прабавалі разбурыць новыя соцыялістычныя адносіны ў вёсцы, узнікшыя ў выніку перамогі калгаснага ладу, абудзіць у сялянстве прыватнаўласніцкія тэндэнцыі, вытру-

ціць са свядомасці сялянскіх мас самую ідэю свабоднага калгаснага жыцця.

Гітлераўскія захопнікі не зламалі волю беларускага народа. Народ устаў ва ўвесь свой іспалінскі рост для вядзення святой барацьбы за сваю справядлівую справу, за чэсць, свабоду і незалежнасць Айчыны. Беларускі народ адказаў немцам непрымірымай нянавісцю і найшырэйшай народнай партызанскай вайной.

Сотні тысяч народных мсціўцаў узняліся на бязлітасную вайну з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яны знішчалі акупантаў на вуліцах гарадоў, у сёлах і лясах, на дарогах і на палях. Няспынна ляцелі пад адхос эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага, падрываліся рэйкі, знішчаліся склады, спальваліся масты.

У барацьбе з нямецкімі захопнікамі вырасла і загартавалася трохсоттысячная армія беларускіх партызан. У ліку партызан са зброяй у руках змагаліся звыш 50 тысяч беларускіх жанчын. Сотні тысяч мірнага насельніцтва складалі баявыя партызанскія рэзервы. У жорсткай барацьбе армія партызан нанесла праціўніку каласальныя страты: знішчыла больш поўмільёна нямецкіх салдат і афіцэраў, знішчыла велізарнейшую колькасць тэхнікі ворага. Такі быў вынік усенароднага партызанскага руху, які называўся ўсенародным не толькі таму, што ў нас было пад ружжом больш 300 ты-

сяч партызан, а і таму, што многамільённае беларускае насельніцтва днём і ноччу, чым толькі магло, дапамагала і садзейнічала партызанам.

Беларускі народ поўнасцю выканаў указанне таварыша Сталіна аб стварэнні на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі невыносных умоў для нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На непрымірымую барацьбу з ворагам беларускі народ натхнялі вялікія ідэі партыі Леніна — Сталіна. Партызанскім рухам з першых дзён вайны кіравала Комуністычная Партыя большэвікоў Беларусі і яе Цэнтральны Камітэт.

У Вялікую Айчынную вайну беларускі народ паказаў непарушнае адзінства і бязмежную адданасць сваёй айчыне — Вялікаму Совецкаму Саюзу, большэвіцкай партыі і правадыру совецкага народа — таварышу Сталіну. *(Апладысменты.)* У ходзе барацьбы за сваю свабоду і незалежнасць яшчэ больш узрасла нацыянальная самасвядомасць беларускага народа. Наш народ яшчэ больш стаў цаніць і любіць совецкую ўладу, сваю свабоду, зямлю, перададзеную яму навечна, калгасны лад, пагрозу страты якіх ён так рэальна адчуў.

Таварышы!

За час вайны вырас палітычны і міжнародны прэстыж Совецкай Беларусі, геройчная барацьба і ўклад якой у справу разгрому гітлераўскіх захопнікаў выклікалі прызнанне ўсіх свабодалюбівых

народаў свету. Палітычнае, эканамічнае і культурнае развіццё, якое прайшла Беларусь за годы совецкай улады, было прадоўжана ў часе вайны мерапрыемствамі па далейшаму развіццю і ўмацаванню беларускай дзяржавы.

Вам вядома, таварышы, што X сесія Вярхоўнага Совета Саюза ССР прыняла закон аб прадастаўленні совецкім рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі Народны камісарыят. Гэтае рашэнне прадстаўляе буйнейшую падзею ў жыцці Совецкай Беларусі і азначае новую ступень у справе развіцця і ўмацавання беларускай дзяржавы.

Беларусь, як суверэнная дзяржава, атрымала міжнароднае прызнанне і з'яўляецца цяпер членам Міжнароднай Арганізацыі Аб'еднаных Нацый. Дэлегацыі Беларусі прымалі ўжо ўдзел у некалькіх міжнародных канферэнцыях (у Амерыцы, Англіі, Францыі). Зараз у Лондане на Сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'еднаных Нацый удзельнічае і беларуская дэлегацыя. Беларускі народ уносіць свой уклад у справу барацьбы за працяглы мір і ўсеагульную бяспеку.

Сур'ёзным актам з'яўляецца прызнанне Аб'еднанымі Нацыямі і Польскім урадам заходніх граніц БССР і прызнанне, такім чынам, гістарычна-

справядлівай падзеі — уз'еднання беларускага народа і ўключэння Заходняй Беларусі ў састаў адзінай Беларускай дзяржавы назаўсёды. Гэтым самым ліквідавана бездань, штучна ствараўшаяся нашымі ворагамі паміж Польшчай і Расіяй. Цяпер закладзены трывалыя асновы добрасуседскіх адносін з дэмакратычнай Польшчай, з Польшчай не трухлявай, здольнай разваліцца пры любой гістарычнай непагодзе, а моцнай дэмакратычнай дзяржавай брацкага нам польскага народа. Агульная барацьба польскага і савецкага народаў супроць ненавіснага ворага — гітлераўскіх захопнікаў і ўстанавіўшаеся ўзаемаразуменне даюць усе падставы для яшчэ больш дружаскага збліжэння гэтых дзяржаў.

Таварышы!

Беларускі народ сустракае выбары ў Вярхоўны Совет СССР ва ўмовах велізарнай і напружанай работы па ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі. Нямецкія захопнікі варварска разбурылі гарады і сёлы, прамысловасць, сельскую гаспадарку і культурныя ўстановы нашай рэспублікі. Яны разграбілі калгасы, МТС і разбурылі ўсе калгасныя пабудовы. Поўнасцю знішчылі грамадскае пагалоўе жывёлы калгасаў, нанеслі велізарныя страты асабістай жывёлагадоўлі калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў, ператварылі цэлыя раёны ў пустыні.

Толькі ў сельскай мясцовасці немцамі спалена і разбурана звыш 1.215 тысяч жылых дамоў, гаспадарчых пабудоў, адміністрацыйных і культурных устаноў і г. д. Жыццёвы ўзровень беларускага насельніцтва, у выніку нямецкай акупацыі, моцна знізіўся. Народ аказаўся пазбаўленым самых неабходных прадметаў хатняга ўжытку, жылля, адзення, птушкі, жывёлы.

Сума шкоды, нанесенай нямецкімі захопнікамі народнай гаспадарцы рэспублікі, значна перавышае 75 мільярдаў рублёў.

Дзякуючы дапамозе вялікага рускага народа і другіх брацкіх народаў Савецкага Саюза, дзякуючы гераічнай Чырвонай Арміі, беларускі народ вызваліўся ад нямецкага рабства. Чырвоная Армія вярнула свабоду і незалежнасць працоўным Беларусі, пазбавіла народную гаспадарку ад канчатковага разарэння, а народ—ад поўнага знішчэння.

З уступленнем Чырвонай Арміі ў межы Беларусі, з аднаўленнем органаў совецкай улады ў рэспубліцы пачаліся аднаўленчыя работы ў прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы, пачалося аднаўленне ўстаноў навукі і культуры, а таксама жылля калгаснікаў, рабочых і служачых.

Урад Беларусі, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б змагаліся за ажыццяўленне ўказанняў таварыша Сталіна аб адраджэнні разбураных гарадоў і вёсак, прамысловасці, транспарта, сельскай гаспа-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

даркі, культурных устаноў, стварэння для совецкіх людзей, пазбаўленых ад фашысцкага рабства, нармальных умоў жыцця.

Выконваючы ўказанні вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна, беларускім урадам праблена значная работа па аднаўленню народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Зараз у нас ужо адноўлена больш 60 процантаў энергетычных магутнасцей у адносінах да даваеннага часу. На гэты ўчастак работы ўрадам Беларусі была накіравана вялікая ўвага, бо вырашэнне энергетычнага пытання ёсць рашэнне забяспечання электраэнергіяй прамысловасці і прадпасылка для далейшага разгортвання прамысловых прадпрыемстваў.

За час пасля выгнання нямецкіх акупантаў з Беларусі пушчана 5 тысяч буйных, сярэдніх і малых прадпрыемстваў, многія з якіх ужо даюць прадукцыю. З месяца ў месяц павялічваецца выпуск прадукцыі прамысловымі наркаматамі. У параўнанні, напрыклад, з першым кварталам у чацвертым квартале 1945 года выпуск прамысловай прадукцыі павялічыўся ў два з палавінай разы, а многія наркаматы павялічылі выпуск прадукцыі ў пяць, шэсць разоў.

Значна павялічыўся рознічны тавараабарот. Калі ў першым квартале 1945 года было прадана тава-

раў на 450 мільёнаў рублёў, то ў чацвертым квартале прадана на 1 мільярд рублёў.

У 1945 годзе праведзена велізарная работа па аснашчэнню народнай гаспадаркі Беларусі станочным і энергетычным абсталяваннем. Гэта стварыла сур'ёзныя прадпасылкі для далейшага развіцця і аднаўлення прамысловасці. У нас будзе цяпер свая аўтамабільная і трактарная прамысловасць, прамысловасць сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, прамысловасць па вырабу станкоў, лакамабіляў, тканін і г. д. Вялікія перспектывы маюць паліўная, лесахімічная, мясцовая прамысловасці, якія з месяца ў месяц нарашчваюць магутнасці і ўсё больш будуць даваць прадукцыі. Значыць, зараз нашай задачай з'яўляецца—максімальна хуткі ўвод іх у строй і атрыманне прадукцыі для задавальнення патрэб насельніцтва і будаўніцтва.

З квартала ў квартал растуць капіталаўкладанні. Калі на будаўніцтва і аднаўленне ў першым квартале 1945 года, калі рэспубліка яшчэ не мела будаўнічых арганізацый, па саюзна-рэспубліканскай прамысловасці было ўкладзена 20 мільёнаў рублёў, то ў чацвертым квартале каля 50 мільёнаў рублёў.

Аднак узровень прамысловай вытворчасці ў нас зараз яшчэ ні ў якай ступені не задавальняе патрэбы нашага насельніцтва.

У 1944 годзе выпушчана ўсяго 6 процантаў даваеннай прадукцыі; у 1945 годзе выпушчана адноў-

ленымі заводамі 17 процантаў у адносінах да даваеннага часу, у 1946 годзе ўрадам намечана выпусціць 32 проценты прадукцыі ў адносінах да даваеннага часу.

Ва ўмовах старой царскай Расіі з яе адсталым прамысловым развіццём і індывідуальнай дробнай сялянскай гаспадаркай разбурэнні ў народнай гаспадарцы азначалі-б дзесяцігоддзі жабрацтва і неймаверных нястач мільёнаў людзей.

Нашай дзяржаве, калгаснаму ладу пад сілу вырашыць такую гіганцкую задачу, як аднаўленне разбуранай немцамі народнай гаспадаркі ў кароткія тэрміны.

Урад і Комуністычная Партыя большэвікоў Беларусі, увесь наш народ павінны будуць многа папрацаваць, каб нашу прамысловасць аднавіць, развіць яе вышэй, чым яна была развіта да вайны. Гэта нялёгкая справа ва ўмовах, калі яна так была разбурана. Але павінен адзначыць, што ў выніку напружанай работы ў мінулым годзе мы стварылі для сваёй прамысловасці вельмі сур'ёзныя ўмовы для яе далейшага развіцця.

Так, дастаткова сказаць, што ў нашу рэспубліканскую прамысловасць паступіла да 60 процантаў абсталявання ў адносінах да даваеннага часу, асобныя-ж віды прамысловасці па якасці і па магутнасцях абсталявання зараз пераўзыходзяць ужо іх даваеннае аснашчэнне.

У Мінску ўжо адноўлены поўнасцю даваенныя магутнасці вытворчасці электраэнергіі. У гэтым годзе магутнасці будуць перавышаць даваенныя ў два разы. Гэта—сур'ёзнае дасягненне. Мінск цяпер можа на сябе прыняць нагрузку вялікай колькасці прадпрыемстваў. Апрача таго, у сувязі з наяўнасцю электраэнергіі сталіца можа больш хуткімі тэмпамі аднаўляцца за кошт электрыфікацыі будаўнічых работ. Гэта дазволіць сур'ёзна палепшыць гарадскі транспарт і быт насельніцтва.

У сельскай гаспадарцы праведзена вялікая работа па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. У мінулым годзе пасеўна яравых культур больш на 548 тысяч гектараў у параўнанні з 1944 годам. Агульны процант адноўленых пасеўных плошчаў у адносінах да даваеннага часу ў нашай рэспубліцы складае 73,4. Гэта мае сур'ёзнае значэнне ў справе далейшага аднаўлення калгаснай гаспадаркі.

Значных поспехаў дабіліся калгасы ў справе аднаўлення жывёлагадоўлі. Зараз ужо ёсць больш 21 тысячы жывёлагадоўчых і птушкагадоўчых фермаў. За мінулы год пагалоўе коней у калгасах прырасло больш чым на 70 тысяч галоў, буйнай рагатай жывёлы—на 140 тысяч, свіней—на 30 тысяч, авечак — на 87 тысяч.

Нашай бліжэйшай задачай з'яўляецца ліквідацыя бескароўнасці калгасных сем'яў. Калі на момант

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вызвалення Беларусі ў нас больш палавіны калгасных сем'яў не мелі кароў, то на 1студзеня 1946 года ў асабістым карыстанні калгаснікаў мелася ўжо каля 540 тысяч галоў.

Вялікіх поспехаў дабіліся ў мінулым годзе нашы машынатрактарныя станцыі, выканаўшы план на 112,1 процанта.

Рабочыя, трактарысты, механікі, інжынерна-тэхнічны і кіруючы персанал машынатрактарных станцый Беларусі паказалі ўсяму рабочаму класу рэспублікі бліскучы ўзор высокай соцыялістычнай прадукцыйнасці працы. Мы павінны нашы МТС умацоўваць і яшчэ больш ашчаджаць, улічваючы іх ролю асабліва ў сувязі са станам конскага пагалоўя.

Становішча сельскай гаспадаркі пасля вызвалення ад нямецкіх захопнікаў аказалася надзвычай цяжкім. У калгасах асталося ўсяго 25 процантаў коней. Калгасная жывёла была разграблена поўнасцю, МТС, гаспадарчыя будоўлі калгасаў разбураны. Больш 50 процантаў калгаснікаў не мелі ў асабістым карыстанні ніякай жывёлы. Асвоеныя да вайны 270 тысяч гектараў балотных высокаўраджайных зямель прышлі ў нягоднасць. Калгасы былі пазбаўлены амаль усіх сельскагаспадарчых машын і прылад вытворчасці.

За час акупацыі наша зямля спустошылася. Узровень апрацоўкі палёў знізіўся. Былі знішчаны пра-

вільныя севазвароты. У аднаўленых калгасах цяжкасці з цяглом і машынамі зрывалі ў многіх выпадках правядзенне сельскагаспадарчых работ у лепшыя агратэхнічныя тэрміны, знізілася агранамічная культура і агранамічная тэхніка.

Наша самая галоўная задача ў сельскай гаспадарцы заключаецца ў тым, каб дабіцца прагрэсіўнага павелічэння пладароддзя глебы і бесперапыннага ўзрастаючых ураджаяў. Для гэтага неабходна: поўнасцю аднавіць правільныя травапольныя севазвароты, нарыхтоўкі, выраб і ўнясенне ў глебу ўгнаенняў у патрэбнай колькасці і якасці, поўнасцю аднавіць у колькасных і якасных адносінах насенную справу, аднавіць даваенную агратэхніку і калгаснае цягло.

Калі мы хочам аднавіць калгасную гаспадарку, ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі, трэба падумаць, якім чынам вырасціць у надыходзячым сельскагаспадарчым годзе высокі ўраджай, узняць у калгасах барацьбу за ўраджай, скарыстоўваючы для гэтага ўсе мясцовыя рэсурсы.

Рашэнне задачы павышэння ўраджайнасці мае жыццёва-важнае значэнне для калгасаў нашай рэспублікі. Гэтага можна дабіцца пры далейшым узмацненні палітычнага згуртавання калгаснікаў вакол калгаснай вытворчасці, мабілізацыі іх працоўнай актыўнасці на ажыццяўленне асноўных мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы, якія вядуць

да павышэння ўраджаю. Усё гэта павінна суправаджацца карэнным палепшаннем арганізацыі працы ў калгасах, павышэннем яе прадукцыйнасці.

Таварышы! За прайшоўшы час пасля вызвалення Беларусі дасягнуты значныя поспехі ў справе будаўніцтва і аднаўлення дамоў калгаснікаў і грамадскіх і культурных будынкаў. Адноўлена і пабудавана больш 183 тысяч дамоў, нарыхтавана 25 тысяч зрубаў. Намаганнямі нашага народа перaселена ўжо з зямлянак 16 935 сем'яў, якія былі пазбаўлены прытулку ў выніку вайны.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы